# Гомельскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту імя Францыска Скарыны — 90 гадоў

*К. Д. Варанько,*
*вядучы бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

**Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны з'яўляецца адным з найбуйнейшых навукова-даследчых, вучэбных і культурных цэнтраў Беларусі. Установа вышэйшай адукацыі рыхтуе выкладчыкаў, спецыялістаў для навуковых устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый. Адукацыйны працэс пастаянна ўдасканальваецца, укараняюцца новыя тэхналогіі і метады.**

У 1929 годзе пастановай Цэнтральнага выканаўчага камітэта БССР было прынята рашэнне аб заснаванні ў Гомелі аграпедагагічнага інстытута. Яго ўрачыстае адкрыццё адбылося 8 лістапада 1930 года. Пазней інстытут стаў педагагічным, а ў 1939 годзе яму прысвоена імя В. П. Чкалава. У 1969 годзе ўстанова вышэйшай адукацыі атрымала статус універсітэта, якому ў 1988 годзе прысвоена імя Францыска Скарыны.

У гады Вялікай Айчыннай вайны інстытут знаходзіўся ў эвакуацыі ў Кіраўскай вобласці. У 1944—1945 гадах ён узнавіў сваю працу. Пасля атрымання статусу ўніверсітэта значна пашырыўся шэраг спецыяльнасцей, па якіх вялося навучанне студэнтаў, актывізавалася навуковая работа. У розныя гады ўстанову адукацыі ўзначальвалі І. Ф. Ермакоў, А. В. Сташэўскі, А. П. Эльман, С. Я. Лебедзеў, М. Ф. Лозбень, Ф. М. Казакоў, М. Ф. Аляксейчык, С. Ф. Ажгірэй, М. М. Івашэнка, У. А. Белы, Б. В. Бокуць, Л. А. Шэмяткоў, А. У. Рагачоў. З 2016 года рэктарам універсітэта з'яўляецца С. А. Хахомаў.



**Будынак Гомельскага педагагічнага ўніверсітэта імя В. П. Чкалава (цяпер — Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны). 1955 год**

Ва ўніверсітэце функцыянуюць 13 факультэтаў: біялагічны, геолага-геаграфічны, гістарычны, падрыхтоўкі да паступлення ў ВНУ, замежных моў, матэматыкі і тэхналогій праграміравання, псіхалогіі і педагогікі, фізікі і інфармацыйных тэхналогій, фізічнай культуры, філалагічны, эканамічны, юрыдычны і завочны. Дзейнічаюць аспірантура (з 1960 года), дактарантура (з 1997 года), магістратура (з 2004 года), а таксама тры саветы па абароне дысертацый па чатырох спецыяльнасцях, у тым ліку адзін доктарскі. У структуру ўніверсітэта ўваходзяць Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, Інстытут Канфуцыя (дзейнічае сумесна з Нанкінскім універсітэтам навукі і тэхналогіі, г. Нанкін, КНР), а таксама два навукова-даследчыя інстытуты: гісторыі і культуры ўсходнеславянскіх народаў і фізіка-хімічны. Функцыянуе Цэнтр калектыўнага карыстання па экалагічным маніторынгу і даследаванні саставу і ўласцівасцей рэчываў («Ізамер»). Працуюць музей-лабараторыя Францыска Скарыны, археалагічны музей-лабараторыя, музей «Жывёльны свет Рэспублікі Беларусь», літаратурны музей, літаратурна-асветніцкі цэнтр памяці аб Вялікай Айчыннай вайне «Патрыётыка» і інш. Установа мае добрую матэрыяльна-тэхнічную базу, сучасную навуковую бібліятэку. Універсітэт выдае навуковыя часопісы «Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины», «Проблемы физики, математики и техники», газету «Гомельскі ўніверсітэт».

Арганізацыйным і каардынацыйным цэнтрам навуковых даследаванняў, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці ўніверсітэта з'яўляецца навукова-даследчы сектар. Сфарміраваліся і паспяхова працуюць 11 навукова-педагагічных школ і 15 навукова-даследчых лабараторый. Праводзяцца фундаментальныя, пошукавыя і прыкладныя даследаванні, на аснове якіх выдаюцца манаграфіі, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, зборнікі навуковых прац і матэрыялаў канферэнцый і інш. Кожны год у сакавіку — красавіку ва ўніверсітэце арганізуюцца дні студэнцкай навукі, у рамках якіх на ўсіх факультэтах праходзяць тэматычныя студэнцкія навуковыя канферэнцыі. Выдаецца зборнік тэзісаў найбольш цікавых дакладаў студэнтаў, аспірантаў і магістрантаў «Дни студенческой науки», а таксама зборнік навуковых работ студэнтаў і аспірантаў «Творчество молодых».

Ажыццяўляецца супрацоўніцтва з многімі ўстановамі вышэйшай адукацыі і навуковымі арганізацыямі Беларусі і краін блізкага і далёкага замежжа. Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт прыняты ў Еўразійскую асацыяцыю ўніверсітэтаў, уваходзіць у склад кансорцыума ўніверсітэтаў расійска-беларуска-ўкраінскага памежжа. Цесныя вучэбна-навуковыя сувязі падтрымліваюцца з асобнымі ВНУ Англіі, Германіі, Італіі, Францыі, Кітая, Польшчы і інш. Універсітэт далучыўся да міжнародных адукацыйных праектаў і праграм: Erasmus Mundus, TEMPUS, IAESTE, Inter-Academia і інш. Многія студэнты праходзяць практычнае навучанне за мяжой.

Ва ўніверсітэце створаны неабходныя ўмовы для развіцця творчых і спартыўных здольнасцей студэнтаў. Арганізацыяй працы па эстэтычным выхаванні займаецца студэнцкі клуб. З 24 творчых калектываў розных напрамкаў пяць маюць званне «Народны». Маладыя паэты, мастакі, скульптары, дызайнеры, архітэктары, харэографы прымаюць актыўны ўдзел у многіх раённых, гарадскіх, абласных, рэспубліканскіх і міжнародных мерапрыемствах. Папулярнымі сталі міжнародныя фестывалі «Арт-сесія» і «Арт-галерэя», што ладзяцца ва ўніверсітэце. За год рэалізуюцца дзясяткі сацыяльных праектаў, у якіх прымаюць удзел каля 2,5 тыс. чалавек («Мой летапіс навейшай гісторыі», «Лабараторыя візуальнай гісторыі», «Мы служым дзецям» і інш.). Студэнты ўдзельнічаюць у Рэспубліканскай выстаўцы «Арт-акадэмія», конкурсах «Аўтограф», «АРТ-партал», інтэрнэт-праектах, праектах «100 ідэй для Беларусі», «Інавацыі — справа маладых!» і інш. Штогод спартыўным клубам універсітэта праводзіцца больш за 70 мерапрыемстваў:

спартакіяды, турніры, дні здароўя. Зборныя каманды ўніверсітэта — удзельнікі гарадской спартакіяды і Рэспубліканскай універсіяды сярод ВНУ. Ва ўстанове адукацыі функцыянуюць валанцёрскія фарміраванні з агульнай колькасцю больш за 4 тыс. чалавек.

У ліпені 1999 года Гомельскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту імя Францыска Скарыны быў прысуджаны Ганаровы дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. За заслугі ў развіцці вышэйшай школы, навукі і культуры ён узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Шматгадовая мэтанакіраваная праца, захаванне традыцый, укараненне сучасных падыходаў да вучэбна-выхаваўчага працэсу, актыўнае правядзенне навуковых даследаванняў і практычнае выкарыстанне іх вынікаў з кожным годам усё больш павялічваюць прэстыж універсітэта ў рэспубліцы і за яе межамі.

**Спіс рэкамендаваных крыніц**


**1.** Гомельскі універсітэт імя Ф. Скарыны // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. — Мінск, 1997. — Т. 5. — С. 348—349.

**2.** Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. — Мінск, 1996. — Т. 3. — С. 73.

**3.** Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны // Культура Беларусі : энцыклапедыя : у 6 т. — Мінск, 2012. — Т. 3. — С. 105.

**4.** Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. — Мінск, 2009. — Т. 1. — С. 255.

**5.** Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны // Памяць : Гомель : гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі : у 2 кн. / уклад. П. П. Рабянок ; рэдкал. : Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск, 1999. — Кн. 2. — С. 335—338.

**6.** *Хахомов, С. А.* Гомельский государственный университет имени Ф. Скорины / С. А. Хахомов // Вузовская наука Беларуси / сост. : С. Г. Девяткова, Т. И. Жуковская, В. Ф. Николайчук. — Минск, 2017. — С. 228—235.

**7.** *Зеленкова, А. И.* Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины (1930—2015 годы) / А. И. Зеленкова, Н. Н. Мезга, М. П. Савинская ; редкол. : А. В. Рогачёв (гл. ред.) [и др.]; М-во образования Респ. Беларусь, УО «Гомел. гос. ун-т им. Ф. Скорины». — Гомель : ГГУ имени Ф. Скорины, 2015. — 266 с.

**8.** *Старовойтов, М. И.* Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины: исторический очерк / М. И. Старовойтов, А. И. Зеленкова, М. П. Савинская ; редкол. : А. В. Рогачёв (гл. ред.) [и др.]; М-во образования Респ. Беларусь. — Гомель : Гомельский государственный университет имени Ф. Скорины, 2005. — 359 с.

**9.** *Зеленкова, А. И.* Малоизвестные страницы истории Гомельского государственного педагогического института (по документам Национального архива Республики Беларусь) / А. И. Зеленкова, М. П. Савинская // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. — 2010. — № 6. — С. 114—120.

**10.** *Савинская, М. П.* Гомельский государственный педагогический институт имени В. П. Чкалова во второй половине 40-х годов XX века / М. П. Савинская // Славянскі свет: мінулае і сучаснае : матэрыялы Рэсп. навук. канф., 26 сак. 2004 г. : 3 ч. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, УА «Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка» ; рэдкал. : А. П. Жытко (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск, 2004. — Ч. 2. — С. 213—218.

**11.** *Зеленкова, А. И.* Становление Гомельского государственного университета (по материалам газеты «Гомельскі ўніверсітэт») / А. И. Зеленкова // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. — 2016. — № 4. — С. 36—41.